УДК 811.161.3(091)

# ІНФІНІТЫЎ У ЭПІСТАЛЯРЫІ Ф.С. КМІТЫ-ЧАРНАБЫЛЬСКАГА

***Д.А. Руклянскі*** (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***М.В. Абабурка***,
д-р філал. навук, прафесар

У помніках усіх жанраў старабеларускай пісьменнасці, як і старажытнай пісьменнасці іншых усходнеславянскіх народаў, пераважаюць формы інфінітыва з суфіксам *-ти* [1]. Але з усіх тагачасных старабеларускіх тэкстах толькі ў «Хранографе» сярэдзіны XVII ст. яны складаюць асноўную норму [2].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Фактычны матэрыял паказвае, што інфінітывы з архаічным суфіксам *-ти* складаюць 26% прыкладаў эпісталярыя: *веда**ти**; писа**ти** (Л. 1), досягну**ти**; зна**ти**, дава**ти**; става**ти**, заклада**ти**; опатрова**ти**; бы**ти** (Л. 6), высыла**ти**; стоя**ти**; отправи**ти** (Л. 12).* Што да інавацыйных формаў інфінітыва з рэдукаваным галосным фарманта, то эпісталярый адлюстроўвае моцную тэндэнцыю да іх выкарыстання (71% прыкладаў): *веда**ть**; чыни**ть**; поважа**ть**; постерега**ть**; показова**ть**; зостави**ть**; поратова**ть**; роска-за**ть** (Л. 16), потеря**ть**; прекласда**ть**; чинии**ть**; слуха**ть**.* На падставе ажыццёўленых назіранняў над тэкетамі было выяўлена, што тып інфінітыва з асновай на кансанант характарызуецца значна меншай ступенню пашыранасці выкарыстання ў параўнанні з інфінітывам на галосны (2%): *прий**ти** (Л. 7), полез**ти**; вес**ти** (Л. 13), ити (Л. 1, 8, 12, 13, 19).* Працэс рэдукавання ненаціекных гукаў закрануў і разглядаемыя формы: *кла**сть** (Л. 14), прине**сть** (Л. 12), доне**сть** (Л. 17), прыне**сть** (Л. 23).* Помнікі не толькі старажытнарускага, але і старабеларускага перыяду рэгіструюць такія ўтварэнні з фармантам *–чи* (1%): *стере**чи** (Л. 15).* Пад уздзеяннем народных гаварок лісты Ф.С. Кміты-Чарнабыльскага адлюстроўваюць дзве формы, у якіх канцавое *-и* страцілася: і *забе**ч** (Л. 13), постере**ч** (Л. 28).* Такім чынам, колькасная перавага інфінітываў новага ўтварэння над старымі з асновай на галосны сведчыць аб значным уплыве народнай мовы на пісьмовую з яе традыцыйнымі сродкамі.

**Літаратура**

1. **Півторак, Г. П.** Морфологія інфінітива в східнослав'янских мовах / Г. П. Півторак. – Київ, 1974. – С. 18.
2. **Свяжынскі, У. М.** Гістарычныя запіскі Ф. Еўлашоўскага / Г. П. Еўлашоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – С. 72
3. **Коршунаў, А. Ф.** Помнікі старажытнабеларускай пісьменнасці. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова